**Мароз, М.** Гара з гарою не сходзяцца… / М. Мароз // Герой працы (Шуміліна). — 2013. — 15 лют. — С. 1, 4.

# ГАРА З ГАРОЮ НЕ СХОДЗЯЦЦА…

***Час мяняе людзей, іх густы і захапленні. Было, калі юнакі марылі, проста трызнілі небам, хацелі стаць касманаўтамі, марылі адправіцца на якую-небудзь далёкую палярную станцыю. Валерый Палякоў – з той эпохі, калі трызнілі і любілі рамантыку. Праўда, у «чыста» лётнае вучылішча ён не пайшоў – паступіў у авіяцыйна-тэхнічнае ў Даўгаўпілсе.***

Закаўказская ваенная акруга – асаблівы этап у жыцці Валерыя Палякова. Тут рыхтавалі для баёў у гарах Афганістана з сумна памятнага 1979-га, калі нашы войскі ўвязаліся ў нялёгкую і, як пазней стала вядома, зацяжную вайну. Не абмінуў афганскі лёс і старшага лейтэнанта Валерыя Палякова. Праўда, ніхто, і афіцэры таксама, не адпраўляліся туды пад прымусам – так сцвярджае сам герой замалёўкі. Адмаўляліся паслужыць у «гарачай кропцы» літаральна адзінкі. Палічыў за гонар паляцець у Афган і Валерый. Туды рыхтавалі 101-ую эскадрыллю штурмавой авіяцыі. Дарэчы, самалёты атрымалі назву «гракі» – па выцягнутай форме «дзюбы»...

Паляцеў Валерый Палякоў, меўшы ўжо сваю сям'ю. Ягоная жонка, Любоў – таксама, як і ён, з Шуміліна. Пазнаёміліся вучнямі і не расставаліся, нават, калі вучыліся ў розных гарадах, знаходзілі час патэлефанаваць, напісаць ліст. На канікулы курсант абавязкова прыязджаў дадому, і яны адводзілі душу ў гаворцы і ўзаемных прызнаннях. Словам, усё ішло да вяселля. І яго згулялі, не паспеў Валерый толкам паслужыць у Астрахані, куды накіравалі адразу пасля вучылішча...

Афган прайшоў не толькі праз яго лёс – ён зачапіў сваім трывожным крылом усю сям'ю, і жонку, і дачку Віку таксама. Іх не менш, а мо і больш, чым яго самога. Ён паляцеў з сябрамі-аднапалчанамі, ён мужны, ён – баец, і яны жылі чаканнем яго вяртання. Адправілі на год. Валерый чакаў змену, але яе ўсё не было. Зноў чаканне, яшчэ больш напружанае і трывожнае.

Можа, таму, што яго дома чакалі, і вярнуўся Валерый Палякоў у сваю часць жывы і здаровы, хаця хапіла па самае не хачу. Няхай у лётчыкаў рызыкі больш, чым у «наземных», але ж хто сказаў, што менш адказнасці ў іх, тэхнікаў? Не радавыя салдаты – афіцэры правяралі ўсё самалётнае «начынне», падвязвалі бомбы, насілі снарады, даводзілі да ладу рацыю, кулямёты, і рабілі гэта і днём, і ноччу. Ноччу, магчыма, і часцей. А наконт рызыкі? Думаеце, іх, наземных, не абстрэльвалі, думаеце, не ведаў вораг, хто адпраўляе савецкія самалёты са смертаносным грузам? Праўда, ніводны тэхнік у час абстрэлаў у іхняй эскадрыллі не загінуў. Затое камандзіру было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Пасмяротна...

Чакалі Люба з Вікай вяртання дарагога ім чалавека цэлыя два з паловай гады. І не было гарантыі, што не паляціць Валерый у Афганістан яшчэ раз. Так і сталася: у 86-ым зноў «паклікала труба ў паход». На гэты раз штурмавікоў СУ-25 у Афганістане была не адна эскадрылля – цэлы полк. У той заезд Валерый вяртаўся ў часць з медалём «За баявыя заслугі» на грудзях...

Кажуць: гара з гарой не сходзяцца, а чалавек з чалавекам сустрэнецца абавязкова. У горадзе Шынданд ён нечакана сустрэў свайго аднакласніка Валерыя Шэдзько. Той быў ужо намеснікам камандзіра верталётнай эскадрыллі, і на пагонах у яго паміж двух прасветаў ззяла зорка маёра. Вядома, выпілі тады па-зямляцку па сто грамаў франтавых, разгаварыліся на ўспаміны. Сумна было развітвацца, аднак – вайна, у кожнага свае ваенныя абавязкі...

Ці часта ўспамінае капітан у адстаўцы Валерый Мікалаевіч Палякоў свой Афган? Згадвае. І тады, калі гартае фотаальбом, і тады, калі сустрэне на вуліцы афганца і спытае будзённа: «Ну, як жывеш?», і тады, калі прыспее дзень 15 лютага...

**М. Мароз**